*У. Ф. Красюк*

## БЕЛАРУСКАЯ КУЛЬТУРА Ў СВЕЦЕ СУЧАСНЫХ МАДЭРНІЗАЦЫЙНЫХ ПРАЕКТАЎ

Развіццё айчыннай культуры звязана з наяўнасцю розных знешніх фактараў, якія аказваюць на яе істотны ўплыў. Сярод іх актуальна адзначыць тыя, якія ў сённяшнім свеце з'яўляюцца вызначальнымі. Гэта пераход грамадства да постіндустрыяльнай стадыі існавання, яго ўсебаковая мадэрнізацыя, інфарматызацыя сацыякультурнай дзейнасці. У чым сутнасная повязь гэтых з'яў у дачыненні да культуры, якія маюцца сусветныя тэндэнцыі і як гэта адгукаецца на станаўленні беларускай культуры?

Для многіх краін пераход да новага этапу сацыяльна-эканамічнага развіцця ляжыць праз усебаковую мадэрнізацыю. Мадэрнізацыя ў шырокім значэнні паняцця – пераход ад аднаго этапу развіцця соцыуму да другога, у вузкім – гэта даганяючая мадэрнізацыя. Асаблівасцю з'яўляецца тое, што імітацыя чужога вопыту, перайманне як галоўны метад даганяючай мадэрнізацыі, схематычныя арыентацыі на «перадавое», «лепшае» ў той ці іншай ступені можа добра рэалізавацца ў матэрыяльнай сферы, але не ў духоўнай. Імітацыя не ў стане замяніць гістарычна выпрацаваную культуру. У гэтым імкненне вяртання да каштоўнасцей папярэдняй эпохі, да народных традыцый, да нацыянальнай культуры. Вяртанне ўласнага культурнага багацця, увага да аксіялагічных прыярытэтаў духоўнай спадчыны з'яўляюцца рэакцыяй на магчымае расчараванне ад новаўвядзенняў, якія цяжка ўспрымаюцца ад нялепшых іх праяў, ад чаканняў, якія не збыліся.

Таму зразумела, што не імкненне да прыняцця чужога вопыту павінна стаць стымулам абнаўлення, а стварэнне нацыянальнай духоўнай канцэпцыі, здольнай аб'яднаць розныя сацыяльныя сілы, выпрацоўка сучасных формаў адраджэння з'яўляюцца рухам наперад. Гэта ёсць рух з мэтаю захавання і памнажэння багаццяў нацыянальнай культуры. Так, ідэалогія згоды, салідарнасці, супрацоўніцтва, заснаваная на традыцыях беларускай нацыянальнай культуры, стварае для нашага грамадства магчымасць рэалізацыі мадэрнізацыйных праектаў. Культура становіцца дамінуючай катэгорыяй у распрацоўцы напрамку мадэрнізацыі. Даганяючая мадэрнізацыя пачынаецца менавіта з культуры, з прыняцця ідэйна-праектных арыентацый, тады як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

класічная зараджаецца з экономікі, з базісных эканамічных перадумоў якаснага абнаўлення.

Уваходжанне ў інфармацыйнае грамадства прадугледжвае для транзітыўных супольніцтваў неабходнасць выбару свайго шляху развіцця. У 60-я гг. XX ст. Т. Парсанс прапанаваў стандартныя мадэлі вестэрнізацыі краін, якія сталі на шлях абнаўлення. Сёння становіцца відавочным, што для кожнага грамадства неабходна свая спецыфіка пераўтварэнняў. Асаблівасць працэсу ў тым, што мадэрнізацыя адбываецца ў эпоху глабалізацыі, якая суправаджаецца ўніфікацыяй і стандартызацыяй зыходных абнаўляльных падыходаў. Тым больш гэта датычыцца культуры, сутнасныя зрухі ў якой маюць месца пад уплывам пашырэння масавых камунікацый і стварэння агульнапланетарнай інфармацыйнай прасторы. Таму развіццё культуры зазнае значныя змены; перабудоўваючыся ў межах «глабальнае–лакальнае», яна адначасова выступае генератарам мадэрнізацыйных зрухаў.

Адным з аспектаў мадэрнізацыі, якi тычыцца і беларускай рэчаіснасці, з'яўляецца праблема масавізацыі культуры. Праблема – не новая ў праекцыі постмадэрнісцкага мыслення, аднак у кантэксце сучасных падзей захоўвае сваю актуальнасць, набываючы часам хваравіты кантэкст. Паколькі мадэрнізацыя пачынаецца з культуры, то ва ўмовах глабалізацыі значэнне, змест і ўплыў масавай культуры становяцца дамінуючымі адносна другіх сфер духоўнага жыцця, бо менавіта ў ёй канцэнтруецца жыццёвая энергія шырокіх колаў насельніцтва.

Хто з'яўляецца носьбітам масавай культуры? Неабходна адрозніваць масу і народ, які жыве культурнымі традыцыямі. Народная культура – гэта культура нацыянальная, масавая культура айчыны не мае. Згодна з Х.Артэга-і-Гасэтам, прыцягненне мас да палітычнага і культурнага жыцця – з'ява, з якой неабходна лічыцца, бо «паўстанне мас» выклікала з'яўленне масавай культуры як спосабу іх культурнага абслугоўвання і арганізацыі. Паяўляецца адпаведная ідэалогія як пераход ад рацыянальнасці і рэлігійнай веры да матэрыяльных інтарэсаў натоўпу. Масавы чалавек прыкрываецца культурай як адзежай, ён культуру спажывае, становіцца агрэсіўным у адносінах да нязгодных. Паколькі маса – зручны аб'ект ідэалагічнага маніпуліравання, то масавая культура ёсць неабходны інструмент ператварэння народа ў масу, якая лёгка падпарадкоўваецца знешняму ўздеянню. Па ацэнцы О.Шпенглера, масы – гэта радыкальнае нішто, гэта Канец; уздзеянне на масы з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дапамогай масавай культуры робіць іх больш цывілізаванымі, але менш культурнымі, зніжаючы агульны ўзровень культуры.

Змест масавай культуры, яе стандарты не адпавядаюць патрабаванням культурнага ўдасканалення, арыентацыі на высокую культуру. Таму якая-небудзь ідэя, хваля, не адпавядаючая патрэбам нават самога натоўпу, пры падтрымцы СМІ, як вірус, здольна авалодаць ім, становячыся матэрыяльнай сілай.

Таму масавая культура не адпавядае патрабаванням і справе мадэрнізацыі грамадства, яна не валодае творчым патэнцыялам. Ідэалогія прымітыўнага спажывання прапаведуе карыстанне выпрацаванымі прадуктамі жыццядзейнасці грамадства, тады як мадэрнізацыйныя праекты патрабуюць абнаўлення культуратворчых патэнцыялаў.

Трэба адзначыць яшчэ адну акалічнасць, якая датычыць ролі і зместу культуры ў навацыйных працэсах сучаснасці. Справа ў тым, што само развіццё культуры з'яўляецца супярэчлівым, яно ўнутрана не адэкватна сучаснасці, тым больш накіраванасці ў будучыню. Традыцыйна ад яе чакалі духоўнага аздаблення гістарычнай эпохі. Яна павінна была ствараць артэфакты і ідэі, адпаведныя выклікам часу. Аднак сёння культуратворчасць усё больш адбываецца праз камп'ютарныя тэхналогіі, што ставіць шэраг раней невядомых праблем. Выкарыстанне навейшых інфармацыйных сістэм, магчымасцей Internet дае значныя выгоды. Аб гэтым шмат гаворыцца. Аднак не трэба закрываць вочы і на адваротны бок дадзенага працэсу. Ствараецца віртуальны свет, вектар накіраванасці якога не заўсёды супадае з патрэбамі канкрэтнага вырашэння грамадскіх спраў. Сённяшнія інтэлектуалы могуць не толькі не адклікацца на рашэнне задач рэчаіснасці, але і ігнараваць іх, не ўспрымаць імкліва нарастаючую складанасць жыцця, больш таго – «уцякаць у машыну», у віртуальную рэальнасць, свядома адыходзіць ад праблем гуманізму і каштоўнасцей «жывога» жыцця. Таму супрацьстаянне паміж культурна-гістарычным і тэхнагенным у развіцці соцыуму будзе абвастрацца. Адыход ад магістральнага шляху развіцця культуры, заснаванага на сапраўдных, а не на віртуальных каштоўнасцях, ніяк не будзе садзейнічаць вырашэнню нацыянальна-культурных праблем, не дапаможа і мадэрнізацыі соцыуму, нарэшце, не адпавядае патрэбнасцям і сутнасці самога інфармацыйнага грамадства, якое прызначана рэальнаму, а не віртуальнаму свету.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Культура, якая выконвае сваю гістарычную місію, заўсёды ёсць адзінства канкрэтнага, нацыянальнага і агульнага, разглядаемага ў гістарычным кантэксце сусветнай культуры. Усякая культура ёсць элемент сукупнай творчасці чалавецтва, раскрываемай у той ці іншай эпосе. Мае месца ўзаемадзеянне і ўзаемаўплыў культур, адным з яго непазбежных аспектаў з'яўляецца феномен самаідэнтыфікацыі як механізм, унутрана прыдатны культуры. Для беларусаў гэта праблема жыцця і смерці. Неізаляванае існаванне этнасу азначае суадносіны з культурамі іншых народаў, гэтым адначасова выяўляецца самаўсведамленне асаблівасці сваёй культурнай адметнасці. Пра гэта гаварылі М. Бахцін, Ю. Лотман, Б. Поршнеў. Б. Ф. Поршнеў адзначаў, што самаўсведамленне сябе ў якасці нейкага «мы» зацвярджае суадносіны, узаемадзеянне гэтага «мы» з нейкім «яны» [1, с.107]. Самаідэнтыфікацыя як аб'ектыўная неабходнасць рэалізуецца цераз суб'ектыўныя адносіны людзей да сваіх культурных каштоўнасцей, нормаў, традыцый, мовы, гістарычнага мінулага. Імкненне разабрацца, «хто мы?», «адкуль наш род?», актуальна ставіць пытанне «А хто там ідзе?». Неадказ на яго, парушэнне працэсу самаідэнтыфікацыі вядзе да непаўнацэннага стану культуры, адбываецца адчужэнне носьбітаў нацыянальнай культуры ад сваіх гістарычных каранёў.

Пераадоленне крызісу культуры бачыцца ў вяртанні да вытокаў сацыякультурнага жыцця, да гістарычнага айчыннага вопыту, які павінен «працаваць», да пераадолення адчужанасці ад нацыянальных традыцый, да адраджэння культуры нацыі, да арганічнага спалучэння этнічнай спецыфікі з лепшымі ўзорамі сусветнай культуры. Талерантнасць зусім не перашкаджае магчымасці зацвердзіць сваё «Я» ў агульным працэсе сусветнай культуратворчасці.

Крызіс сучаснай цывілізацыі абумоўлівае неабходнасць сумесных намаганняў, тым больш у рэчышчы глабалізацыйных працэсаў, у пошуку рэальных шляхоў пабудовы сістэмы зносін паміж народамі. Адным з такіх шляхоў з'яўляецца гістарычны іх вопыт у перакрыжаванні з сённяшнімі тэндэнцыямі, напрыклад, супрацьстаяннем «атлантызму» і «еўразійства». Даследчыкі адзначаюць, што гісторыя беларускай культуры, яе цяперашняе развіццё могуць стаць прыкладам міжкультурнага дыялогу, талерантнасць тут з'яўляецца асновай ўзаемаразумення. «Спецыфікай сінтэзу культур у гісторыі беларускага грамадства

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стала тое, што ён узнікаў не праз канфлікты і войны, але ў выніку добраахвотнага прыняцця суб’ектамі адной культуры элементаў другой культуры» [2, с.165]. Менавіта імкненне да згоды пры захаванні сваёй ідэнтычнасці павінна стаць арыенцірам нашага культурнага развіцця ва ўмовах глабалізацыі, вырашэння мадэрнізацыйных праектаў, уваходжання ў інфармацыйнае грамадства. Таму актуальным з’яўляецца заклік нацыянальна сталай беларускай інтэлігенцыі: «Адродзім нацыянальную культуру, свядомасць, родную мову беларусаў і ўсіх народаў, што жывуць у нашай краіне» [3, с.199].


1. *Поршнев, Б. Ф.* Социальная психология / Б. Ф. Поршнев. – М.: Наука, 1979. – 212 с.

2. *Трансформация* мировоззрения в современном транзитивном обществе: материалы Респ. науч. конф., Минск, 23 ноября 2007 г. / Белорус. гос. пед. университет им. М. Танка; под ред. В. В. Бущик [и др.]. – Минск, 2007. – 335 с.

3. *Гістарычны* шлях беларускай нацыі і дзяржавы / М. Біч, Р. Гарэцкі, У. Конан [і інш.]; рэдкал.: У. Арлоў [і інш.]. – Мінск: Медысонт, 2006. – 440 с.: іл.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ